# МЕТАДЫ І ПРЫЁМЫ АРГАНІЗАЦЫІ ПРАКТЫЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ ПА РАЗВІЦЦІ КАМУНІКАТЫЎНАЙ КАМПЕТЭНЦЫІ

В.Ч. Хвайніцкая

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРАСПЕКЦЫЯ

– спосаб папярэджання інфармацыі ў працэсе вучэбнай камунікацыі, які рэалізуецца пры дапамозе ілюстрацый да лінгвістычных правіл, апорных схем, алгарытмаў, пунктаў плана і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ПРАСПЕКЦЫЯ

Прыём спрыяе фарміраванню наступных **камунікатыйна-інфармацыйных** уменняў вучняў:

- разумець асноўную думку выказвання;
- вызначаць апорныя словы і словазлучэнні тэксту;
- перабудоўваць тэкст і выбіраць неабходную інфармацыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-ВУЧЭБНЫ ДЫЯЛОГ

-- форма калектыўнай працы, якая арганізуецца ў межах вывучэння пэўнай лінгвістычнай тэмы

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# Інфармацыйна-вучэбны дыялог

Настаўнік фармулюе пэўную камунікатыўную задачу, выразна акрэслівае прадмет маўлення, вызначае тэму суразмоўніцтва, якая павінна быць зразумелай і актульнай для вучняў.

Падчас інфармацыйна-вучэбнага дыялога вучні ствараюць выказванні на прапанаваную тэму, творча асэнсоўваюць яе, пры неабходнасці дабудоўваюць уласныя тэксты.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# РАЗГОРТВАННЕ ТЭМАТЫЧНАГА СКАЗА АБЗАЦА ТЭКСТУ

-- **прыём**, які накіраваны на развіццё творчых уменняў вучняў

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ТЭМАТЫЧНЫ СКАЗ АБЗАЦА

-- сказ, які ўтрымлівае слова, словазлучэнне ці частку сказа, якія патрабуюць развіцця, дэталізацыі.

У тэксце выбіраецца адзін з названых элементаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# РАЗГОРТВАННЕ ТЭМАТЫЧНАГА СКАЗА АБЗАЦА ТЭКСТУ

Вучні атрымліваюць заданне пашырыць тэматычны сказ абзаца, папоўніць яго, падабраўшы патрэбную інфармацыю, разгарнуць думку, абапіраючыся на ўласны вопыт, прывесці свае прыклады.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# РАЗГОРТВАННЕ ТЭМАТЫЧНАГА СКАЗА АБЗАЦА ТЭКСТУ

Прыём выкарыстоўваецца, калі настаўнік прапаноўвае вучням успомніць асноўную думку, якую хацеў данесці адрасат.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ДАСЛЕДЧЫ МЕТАД

прадугледжвае стварэнне сітуацыі даследавання, у працэсе чаго лінгвістычная інфармацыя ператвараецца ў веды дзякуючы прыёмам **назірання**, **параўнання**, **фармулёўкі праблемы**, **аналізу** моўных фактаў, **абагульнення**, **вываду**, **параўнання** ўласна створанага навуковага тэксту з фармулёўкай падручніка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# МЕТАД ВУЧЭБНЫХ ПАЗНАВАЛЬНЫХ ЗАДАЧ

прадугледжвае, што настаўнік прапануе на пачатку вывучэння тэмы алгарытм дзеянняў, фармулюючы мэты, умову і пытанні задачы.

Умова вучэбнай задачы павінна матываваць дзейнасць вучняў, выклікаць пазнавальную цікавасць, стымуляваць актыўнае развіццё перцэптыўных, маўленчых, разумовых і іншых працэсаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# ЛІТАРАТУРА


1. Змушко, А. М. Выкладанне беларускай мовы ў 4-5 класах дапаможнай школы / А М. Змушко. – Мн.: НМЦ, 2004.
2. Яленскі, М. Г. Метолыка выкладання беларускай мовы. Сучасная лінгвадыдактыка / М. Г. Яленскі. – Мн.: НІА, 2005.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ